Аляксандр Канстанцінавіч Аверкаў

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Аляксандр Канстанцінавіч Аверкаў (руск.: *Александр Константинович Аверков*; 23 студзеня 1960, Аркадак, Саратаўская вобласць, РСФСР) — беларускі журналіст, тэлевядучы. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (2010), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2004).

Біяграфія

У 1984 г. скончыў Тэатральную вучэльню імя Шчэпкіна (курс В. І. Каршунова. Па размеркаванні стаў працаваць на беларускім тэлебачанні ў якасці акцёра гутарковага жанру галоўнай дырэкцыі праграм для дзяцей, рэжысёрам спартыўных перадач. Голасам Аверкава гаварыў папулярны герой «Калыханкі» — Воўк Вова. З чэрвеня Вядучы дырэкцыі інфармацыйнага вяшчэння ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал». З чэрвеня 2002 г. вядучы праграм «Наши новости» і «Контуры» ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал».

У чэрвені 2007 г. разам з паэтам Уладзімірам Карызнам, Аляксандрам Мядзведзем удзельнічаў ва ўстаноўчым сходзе мінскай арганізацыі «Белая Русь». У 2012 г. атрымаў грант Magna Carta College Oxford на навучанне ў Оксфардскім універсітэце.

У свабодны час здымаецца ў расійскіх фільмах і серыялах.

Фільмаграфія

- 1984 — Іншапланецянка
- 1985 — Вялікая прыгода
- 1986 — Міхайла Ламаносаў (студэнт)
- 2004 — Выклік (Рукавішнікаў)
- 2015 — У сузор'е стральца

Аляксандр Канстанцінавіч Аверкаў

Дата нараджэння	23 студзеня 1960 (63 гады)
Месца нараджэння	Аркадак, Аркадакскі раён (https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=%D0%90%D1%80%D0%BA%D0%B0%D0%B4%D0%B0%D0%BA%D1%81%D0%BA%D1%96+%D1%80%D0%B0%D1%91%D0%BD&action=edit&editintro=Шаблон:Няма_артыкула/editintro&preload=Шаблон:Няма_артыкула/preload&preloadparams%5B%5D=Q580844&preloadparams%5B%5D=%D0%90%D1%80%D0%BA%D0%B0%D0%B4%D0%B0%D0%BA%D1%81%D0%BA%D1%96+%D1%80%D0%B0%D1%91%D0%BD&preloadparams%5B%5D=Універсальная+картка)[d], Саратаўская вобласць, РСФСР, СССР
Грамадзянства	СССР Беларусь
Адукацыя	Вышэйшае тэатральнае вучылішча імя М. С. Шчэпкіна (1984)
Месца працы	Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь

- 2016 — Выкрадзі мяне.

Сям’я

Першая жонка, актрыса Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Алёна Акулёнак, ад якой у А. Аверкава нарадзілася дачка Вольга Аверкава-Літвінава (тэлевядучая на «РТР-Беларусь» і «ВТБ») і сын Глеб (урач; жыве ў Маскве).

	Агульнанацыянальнае тэлебачанне
Прафесія	акцёр
Прэміі	
Узнагароды	
IMDb	ID 11439486

Узнагароды і прэміі

- Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2004, у аўтарскім калектыве) — *за стварэнне дванаццацісерыйнага дакументальнага фільма «Найноўшая гісторыя»*.
- Медаль Францыска Скарыны (2006).
- Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» (2010).

Агульнанацыянальнае тэлебачанне [паказаць]	
Тэматычныя сайты	Internet Movie Database (https://www.imdb.com/name/nm11439486) · КиноПоиск (https://www.kinopoisk.ru/name/1817476/)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Аляксандр_Канстанцінавіч_Аверкаў&oldid=4388373"